# Чэк-ліст «Як арганізаваць kids-friendly прастору на мерапрыемстве»

Прастора прыязная для дзяцей — гэта магчымасць для бацькоў цалкам пагрузіцца ў працэс мерапрыемства. Чэк-ліст змяшчае агульныя рэкамендацыі. Кожны пункт можа быць адаптаваны ў адпаведнасці са спецыфікай, фарматам і бюджэтам мерапрыемства.

На што варта звярнуць увагу падчас падрыхтоўкі kids-friendly прасторы:

1. **Куток ці пакой.** У залежнасці ад памераў пляцоўкі варта вызначыцца ці будзе выдзелены асобны пакой для дзяцей, ці гэта будзе куток удалечыні ад бацькоў.
2. **Бяспека.** Праверыць прастору на бяспеку. Калі гэта неабходна — купіць мяккія накладкі на рагі мэблі.
3. **Забавы.** Паклапаціцца пра дастатковую колькасці гульняў, канцылярыі, размалёвак, кніг і іншых забаў. У залежнасці ад бюджэту вы можаце дадаць элементы інтэрактыву ці анімацыі. Чым большым будзе выбар, тым лепш.
4. **Харчаванне.** Забяспечыць у прасторы дасяжнасць вады і ежы, папярэдне даведаўшыся ў бацькоў пра магчымыя алергіі ў дзяцей.
5. **Прыбіральні.** Паклапаціцца пра наяўнасць спецыяльнага крэселка, калі ракавіна знаходзіцца высока, а таксама дзіцячай накладкі для ўнітаза.
6. **Дарослыя валанцёр_кі.** Наняць або запрасіць валанцёр_ак (як мінімум 2 асобы), якія маюць досвед узаемадзеяння з дзецьмі розных узростаў і будуць не толькі сядзець з імі і сачыць за парадкам, але і расказваць гісторыі, размаўляць, гуляць разам.
7. **Праграма для дзяцей.** Яе трэба прадумаць з валанцёр_камі загадзя і ўзгадніць з бацькамі. Гэта можа быць прагляд (мульт)фільма, невялікі інтэрактыўны квэст, чытанне казак услых. Падумаць пра тое, ці ёсць магчымасць уключыць дзяцей у тэматыку мерапрыемства, расказаць ім пра тое, чым займаюцца іх бацькі.
8. **Правілы.** Будзе карысна абмеркаваць з дзецьмі правілы камунікацыі ўнутры дзіцячай прасторы, але не навязваць сваё.
9. **Нічога не забыць пасля.** Калі дзеці прынеслі з сабой свае цацкі, размалёўкі, алоўкі ці гульні — пераканацца, што нічога не было забыта ці страчана.

Галоўнае правіла kids-friendly прасторы — не навязваць дзецям сваіх жаданняў, а чуць і даваць ім магчымасць самім абіраць, чым ім займацца і ў што гуляць. Напрыклад, калі дзецям камфортна знаходзіцца побач з дарослымі, і яны не перашкаджаюць таму, што адбываецца, то не трэба прымушаць іх да знаходжання з другімі дзецьмі.

Чэк-ліст распрацаваны паводле артыкула Сашы Камко «Як арганізаваць добрую kids-friendly прастору на мерапрыемстве», з якога можна больш даведацца пра падрыхтоўку мерапрыемстваў прыязных для дзяцей.